Pierasyłka apłačana ryčałtam

Nr. 1 (642). Wilnia, Sierada 8 Studzienia 1936 h. Hod XII (XX)

БЕЛАРУСКАЯ КРЫНІЦА | BIEŁARUSKAJA KRYNICA

Palityčnaja, hramadzkaja i litaraturnaja hazeta.

Adras Redakcyi i Administracyi: WILNIA, ZAWALNAJA 1—1 (Wilno, Zawalna 1—1). Redakcyja adčyniena ad 9 hadz. ran. da 4-aj uwieč.	HAZETA WYCHODZIĆ RAZ U TYDZIEŃ.	Košty wydawańnia pakrywajuć składki. Składka u hod 4 zał., na paŭhoda — 2 zał., na 3 miesiacy — 1 zał.

Новы год—новая праца

У беларускім жыцьці Зах. Беларусі апошнімі гадамі аканчальна скрысталізаваўся грамадзкі палітычны кірунак: Беларуская Хрысьціянская Дэмакрацыя. Гэты кірунак мае сваю ідэолёгію, ведае чаго хоча, і сапраўды пакідае сьлед у працэсе беларускага нацыянальнага адраджэньня.

У стадыі арганізацыйнай знаходзіцца партыя Беларускіх Нац. Сацыялістаў і пачынае арганізавацца—бліжэй дагэтуль нявядамая — група з «Нашай Волі».

Мы не закрываем вачэй і на той факт, які выціскае пячаць ў адраджэньні Беларускага Народу і камуністычная дзейнасьць, якую ў Зах. Беларусі праводзіць нелегальная арганізацыя КПЗБ.

Мінулы год для БХД прайшоў пад знакам абновы. Палажэньне беларускага народу і палажэньне міжнароднае прынясло апошнімі гадамі цэлы рад праблемаў, якія змусілі БХД да перагляду яе праграмы, да абнаўленьня згодна з патрэбамі народу, згодна з патрэбамі і з духам часу. Дзеля гэтага быў праведзены плебісцыт і апрацаваная праграма. Абноўленая арганізацыя мае называцца БНА (БеларускаеНароднаеАб'еднаньне). Аканчальнае слова што да праграмы і назову належа да Рады БХД. Абнаўленьне адбывалася ў кірунку большага дэмократызму, радыкалізму, у кірунку большага дапасаваньня да патрэбаў працоўных масаў беларускага народу і да вымогаў часу і ўрэшце ў кірунку аб'еднаньня магчыма найшырэйшых беларускіх масаў і інтэлігенцыі.

Да абнаўленьня БХД — паўтараем — змусіла жыцьцё, патрэбы беларускага народу і міжнароднае палітычнае палажэньне.

Абноўленая БХД вытрывала будзе далей працаваць дзеля дабра беларускага народу і дзеля выпрацаваньня для яго найбольш адпаведнай ідэолёгіі, арентуючыся ў гэтым выключна на той-жа свой беларускі народ.

Калі-б і камуністы пачалі сваё абнаўленьне ў кірунку дэмакратызму ў Саветах, а ў іх ліку і ў БСРР, тады для беларускага народу як цэласьці пачаўся-б сапраўды новы сьвет, новая эра.

Новы год — новая праца. Але покульшто выказваем толькі новыя думкі з нагоды новага году, а якая-ж новая будзе наша праца? Арганізаваньне цацьцягам абноўленай БХД беларускіх масаў і беларускай інтэлігенцыі, барацьба з фашызмам, як з найвялікшым сучасным ворагам беларускага народу і барацьба з усякай іншай дыктатурай, а так-жа натужная, арганізаваная праца і барацьба за беларускую асьвету і школу для беларускіх шырокіх працоўных масаў.

А чаму на Новы Год забыліся аб справах эканамічных, аб тэй страшнай галіце, якая пануе на беларускім сяле? — можа хто запытае. Вось-жа мы не забыліся, але мусім свайму народу сказаць праўду, што ў гэтым мы, як і ён, пры сучасным палітычным і соцыяльным палажэньні сусім бяссільны.

Адначасна хочам свайму народу сказаць, што дабрабыт для яго прыйдзе тады, калі ён нам дапаможа належна споўніць вышэйназначаныя задачы на сёлетні Новы 1936 Год.

Дык у добры час да працы!...

За беларускую школу!

Мінуў год стары, пачынаем новы. Як заўсёды, так і гэтым разам робім падсумоўку прошлага, каб на ім разьвіваць будучыню. Вымагае гэтага эканоміка сіл, часу і сродкаў.

Ня маем намеру пералічаць тут усе падзеі, якія зазначыліся ў беларускім жыцьці ў мінулым годзе.

Для большай выразнасьці зьвернем увагу толькі на адзін бок нашага нацыянальнага жыцьця ў Зах. Беларусі, на прасьвету, на школу. Ненармальнасьць гэтага жыцьця беларусы адчувалі ад таго часу, калі 15 з лішнім гадоў таму назад расьцьвіўшае прад тым беларускае школьніцтва ў Зах. Беларусі, трапіўшы ў ненармальныя варункі пачало „корчыцца" і тры гады таму назад было блізу аканчальна зьліквідавана.

У дзіўная рэч, што ў гэту-ж пару — хоць і з іншых матываў— пачынаецца „зацікаўленьне" справай беларускай школы з боку польскага: спачатку з боку адзінак, пасьля арганізацыі і ўрэшце з боку польскіх у нас школьных уладаў. Гэтыя праявы зацікаўленьня мы бачылі й адпаведна ў час натавалі ў працягу апошніх колькі гадоў.

Асабліва выразным паказалася аднак гэта зацікаўленьне ў мінулым 1935 годзе, калі на бачынах самае толькі віленскае польскае прэсы ў справе беларускага школьніцтва пачалі зьяўляцца галасы асоб менш і больш за ўсю школьную ў нас справу адказных. „Бел. Крыніца" ў мін. годзе адзначала некаторыя з гэтых галасоў у нумарох 17-18, 25 і ўрэшце ў № 45 падала зьмест афіцыяльнай, можна сказаць, заявы Віленскага Школьнага Куратара, а значыць галоўнага афіцыяльнага кіраўніка школьнай у нас справы.

Абмінаючы тут усе іншыя галасы, мусім затрымацца на ўспомненай заяве Школьнага Куратара, які „ў жывыя вочы" нам сучасным і патомнаму пакаленьню кідае цьвярджаньне, што ў Зах. Беларусі (акрамя Палесься і Зах. часткі Беласточчыны) на 390.000 дзяцей у публічных (пачаткавых) школах ёсьць быццам толькі няцэлыя 128.000 дзяцей беларускіх, ды што самі беларусы школы ў роднай мове быццам не дамагаюцца.

Ці ж гэта праўда???...

Ведаем, як адбываецца ў нас сяньня сьпісваньне школьных дзяцей паводле нацыянальнасьці. Ведаем так-жа, што гэта значыць „беларусы ня хочуць свае школы".

Але ўсё прамаўляе за тым, што сягоньня ня можна хаваць праўды „пад сукном": яе трэба паказаць навонкі: няверучых трэба пераканаць, нясьведамых усьведаміць, слабых узмоцніць. Як?

Лік беларускіх дзяцей у мясцовых пачаткавых школах і сапраўдная воля іхных бацькоў была ўжо раз паказана ўсяму сьвету складаньнем адпаведных дэкляацыяў школьным уладам. Вышменаваная заява афіцыяльнага кіраўніка школьніцтвам у нашым краю спанукае і проста змушае беларускае грамадзянства Зах. Беларусі гэткі свайго роду школьны плебісцыт паўтарыць.

Вельмі добра разумеем, як цяжка гэта правесьці пры сяньняшніх варунках жыцьця беларускага сялянства, ягоным зьняверанньні да пачынаньняў у кірунку здабыцьця роднай школы, пры нашай арганізацыйнай раздробленасьці ды пры магчымых усякага роду пры гэтым зусюль неспадзеўках. Усё гэта праўда! Але праўда і тое, што тут ідзе аб беларускую нацыянальную чэсьць, у абарону якой мусяць дружна стаць побач сябе усе — але літаральна ўсе — сьведамыя беларусы.

Гэтак разумеючы справу і не ўдаючыся ў тэхнічныя дробязі, пазваляем сабе кінуць вольны ад усякай палітыкі кліч: 1936 год хай будзе нам годам лучнай працы для беларускай школы. Усё жывое беларускае — на фронт беларускага школьнага плебісцыту!

Wacłaŭ Łastoŭski rastralany ŭ Sawietach?

Wacłaŭ Łastoŭski — b. premjer biełaruskaha ŭradu Biełaruskaj Narodnaj Respubliki, jak padaje „Kurjer Wilenki" z dnia 6.I.1936 h., u Sawietach rastralany. Stałasia heta byccam u Adesie kala dwuch hadoŭ tamu nazad.

W. Łastoŭski kamunistyčnaj uładaj byŭ aryštawany ŭ Miensku padčas likwidacyi balšawikami h. zw. „nacdemaŭščyny" — padčas masawych aryštaŭ biełaruskich dziejačoŭ — narodnych kulturnych rabotnikaŭ i sasłany na wolnaje pasialeńnie ŭ Sarataŭ nad Wołhaj.

Pawodle „Kur. Wil." Łastoŭski na ssyłcy byŭ razam z žonkaj i jany adtul aboje ŭciakali, ale ŭcieki nie ŭdalisia — kala Adesy balšawiki ich zławili i rastralali.

Sumnaja i balučaja hetaja wiestka, kali jana praŭdziwaja... Spadziajomsia, što praŭdziwaść hetaha chutka wyjaśnicca.

Pry hetym adznačajem, što adnačasna z W. Łastoŭskim wysłany z Biełarusi ŭ dalokija krai S.S.R.R. i ŭ koncentracyjnyja łahiery mnohija inšyja biełaruskija wučonyja i narodnyja dziejačy. Wysłanyja mnohija tak-ža i biełaruskija sialanie.

Woś-ža my padajom hołas damahańnia amnestyi dla palityčnych wiaźniaŭ u Sawietach i da hetaha zaklikajem usie pracoŭnyja masy.

Ahlad palityki za 1935 hod

Pierahladajučy hadawik hazety—kalendar palityčnaha žyćcia za minuły 1935 hod,—prad wačami stanowiacca abrazy hroznych padziejaŭ i zaŭziataj baraćby narodaŭ i hramadzianstwaŭ — adnych za byt i wyzwaleńnie, a inšych za panawańnie nad druhimi. Dyk prahledzim hety film žyćcia i zmahańnia za jaho ŭ 1935 h. — prahledzim hałaŭniejšyja zdareńni ŭ palitycy za minuły hod.

Abrazki z mižnarodnaj palityki.

U minułym 1935 h. padtruchleŭšy Wersalski traktat amal zusim pierastaŭ abawiazywać źwiazanuju swaimi parahrafami Niamieččynu.

Zhodna z Wersalskim traktatam 13.I.1935 h. adbyŭsia plebiscyt u Saary i hety kraj pryłučyŭsia da Niamieččyny. Hety fakt pačaŭ raźwiazywać wuzły Wersalskaha traktatu dla Niamieččyny i dalej — dyktatar kancler Hitler 16 sakawika 1935 h. wydaŭ dekret, jakim parwaŭ zabawiazańnie Wersalskaha traktatu ab kantroli i ahraničeńni niamieckaha zbrajeńnia—Hitler abwieściŭ abawiazak wajskowaj słužby ŭ Niamieččynie i biezkantrolnaje zbrajeńnie.

Hetyja zdabyčy Niamieččyny ŭ mižnarodnaj palitycy ŭzwarušyli tady ŭsiu eŭropejskuju dyplomacyju i pačalisia dyplomatyčnyja haściny ministraŭ zahraničnych spraŭ — anhielskija ministry abjechali: Paryž, Waršawu, Maskwu, Prahu i inšyja stalicy eŭropejskich dziaržaŭ. Meta hetkaj wandroŭki ministraŭ była — zarjentawacca ŭ palityčnym pałažeńni i arhanizawańnie abarony miru suproć mahčymych napadaŭ Niamieččyny.

Śledam za anhielskimi dyplomatami pajechaŭ praz Waršawu ŭ Maskwu Lawal — francuski ministr zahraničnych spraŭ.

Paśla ministerskich razjezdaŭ pa eŭropejskich stalicach paŭstaŭ francuska-sawiecki sajuz i sajuz sawiecka-čechasławacki, jakija nakirawany suproć Niamieččyny na wypadak napadu apošniaj na hetyja sajuznyja dziaržawy biesparedna, abo pasredna praz inšyja dziaržawy.

Pobač z hetymi praciŭniamieckimi sajuzami ŭzmacniŭsia i sajuz nadbałtyckich dziaržaŭ — Litwy, Łatwii i Estonii, jakija ŭ abaronie swajej niezaležnaści swoj sajuz nakirawali

tak-ža i prociŭ mahčymych napadaŭ z boku Niamieččyny.

Pahroza wajny z boku fašystoŭskaj Niamieččyny była stwaryŭšy supolny front Anhlii, Francyi i Italii suproć napadu niamieckaha hitleroŭskaha imperjalizmu i tady ŭ Lizie Narodaŭ asudzili Niamieččynu za samawolnaje zbrajeńnie i hetym sarwańnie dahaworu Wersalskaha traktatu. Ale Niamieččyna machnuła rukoj na pastanowu Lihi i zbrajeńnie swajej armii i floty nia spyniła.

Uporystaść Niamieččyny źmiakčyła stanowišča Anhlii, jakaja paśla zaklučyła z Niamieččynaj marski dahawor.

Imperjalistyčnyja parywy niamieckaha hitleryzmu i stojkaść niamieckaj dyplomacyi razachwocili da agresii ŭ Afrycy italijanskaha fašysta Musoliniaha, jaki z bolšym naciskam čymsia Hitler puściŭsia ŭ pachod na Abisyniju.

Pačałasia ŭ Afrycy italijanska-abisynskaja wajna. Suproć Italii wykazaŭsia amal uwieś świet. Musolini ŭ dyplomacyi akazaŭsia słabiejšym za Hitlera.

Hetaja wajna ŭ Afrycy ciapier pahražaje tak-ža wajnoj i Eŭropie, jakoj bajacca ŭsie eŭropejskija dziaržawy, apračа chiba tolki adnej Niamieččyny, jakaja ŭściaž hatowicca jści wajnoj na eŭrapejski ŭschod, jak Italija na Abisyniju.

Słowam, palityčnaje pałažeńnie ŭ Eŭropie naprużanaje, u Afrycy wajna, u Azii tak-ža śmiardzić porachawy dym, jaki padražniaje nozdry i zaakijannaj Amerycy.

Takim čynam 1935 hod pakinuŭ palityku ŭzburanuju na ŭsim świecie, bo Aŭstralija, ab jakoj my tut nia ŭspomnili, samastojnaj palityki nia maje.

Japonska-kitajska-rasiejskija suadnosiny ŭ Azii.

Japonija maje na mecie abjadnać Aziju i stwaryć sajuz azijataŭ pad swaim pawadyrstwam. Japoncy kidajuć klič, što „Azija tolki dla azijataŭ“. U 1935 hodzie japoncy ŭ Azii, dziela swajho tam panawańnia, šmat dziejali — zakraplali niezaležnaść ad usich inšych dziaržaŭ, apračа Japonii, Mandžuryi i zawodzili swaje militarna-palityčnyja ŭpływy wa ŭsim Kitaju. U kancy 1935 h. japoncy ŭtwaryli nowyja aŭtanomnyja respubliki, jakija źjaŭlajucca dla Japonii takimi ž prawincyjami, jak i Mandžuryja.

Kitaj ahułam raźbity na sfery čužych upływaŭ, hałoŭna na sfery ŭpływaŭ japonskich i balšawicka-rasiejskich. Akcyja Japonii ŭ Kitaju zwužaje tamašnija ŭpływy rasiejskija i dziela hetaha isnuje pawažnaja pahroza wajny miž Japonijaj i Sawietami na Dalokim Uschodzie.

Z polskaj zahraničnaj palityki.

U praciahu minułaha hodu polskaja zahraničnaja palityka nie asiahnuła dobrych susiedzkich adnosinaŭ z Litwoj, z katoraj dasiul Polšč niamaje nijakich znosinaŭ. Adnosiny susiedzkija Polščy z Sawietami, jakija ŭ 1934 h. byli kumoŭskija, u 1935 h. źmianilisia zusim na čužackija. Pryčynaj hetamu polska-niamiecki sajuz, jaki supiarečny dla abaronnaj suproć Niamieččyny sawieckaj palitycy. U źwiazku z polska-niamieckim sajuzam paŭstała ŭ 1935 h. silnaja naprużanaść u palitycy Polščy adnosna Čechasławaččyny. Pakinuŭ 1935 hod zimnyja suadnosiny Polščy z Francyjaj, a tak-ža i z nadbałtyckim sajuzam dziaržaŭ — Litwy, Łatwii i Estonii.

Hetkuju spadčynu pakinuŭ 1935 hod u mižnarodnaj palitycy.

Ahułam kažučy, palityčnaja spadčyna na 1935 h. dla 1936 h. niebiaśpiečnaja i hroznaja — u Afrycy wajna, u Azii dymiacca wohniščy wajny, a ŭ Eŭropie hatowiacca wajawać.

p—k.

З БЕЛАРУСКАГА ЖЫЦЬЦЯ

Новы Год у Б.І.Г.і К. Віленскі Аддзел Бел. Інст. Гасп. і Культуры за прыкладам мінулых гадоў ладзіў традыцыйнае спатканьне Новага Году. Віленскія беларусы ўсіх палітычных кірункаў (больш 60 асоб) сабраліся ў залі Інстытуту (Завальная 1) і спаткалі Новы 1936 Год.

„Наша воля“. Пад гэткім загалоўкам пачала ў Вільні выходзіць новая беларуская газэта, якая мае быць выдаванай два разы ў месяц.

„Золак“. № 1, 1935 г., з падзагалоўкам „орган маладой беларускай соцыялістычнай думкі“. Зьмест гэтага нумару ад пачатку да канца дэфэнзыўнага характару і паказвае, што гэта працяг дывэрсіі, якую пачала „Беларусь Працы“.

„Правы нацыянальных меншасьцяў у Польшчы“. На гэту тэму дня 1.I.36. мгр. Я. Шутовіч меў рэфэрат у в. Шугавічах, Ашмянскага пав.

Вечар Беларускай літаратуры. Прафэсыянальны Саюз Польскіх Літаратараў у Вільні арганізуе вечар беларускай літаратуры. Вечар адбудзецца дня 15-га г. м. на Вострамскай 9. Пачатак а гадз. 20 й. У праграме — *два рэфэраты*: гр. А. Луцкевіча — *аб беларускай літаратуры нашаніўскай пары* і мгра Ст. Станкевіча — *аб сучаснай беларускай паэзіі.* Падчас чытаньня рэфэратаў будуць рэцытавацца гр. Фр. Аляхновічам і студ. Г. Сухой беларускія вершы.

Арышт. У м-цы сьнежні м. г. паліцыя арыштавала вучня VI кл. Віленскай Беларускай Гімназіі. Ул. Рагача.

Сумныя весткі. Многа вучняў, бо аж каля 20 проц., Віл. Бел. Гімназіі змушаны перарваць сваю навуку з прычыны немагчымасьці аплаціць належнасьці за навуку.

Ад слоў да дзела!

Зусім безстаронна трэба прызнаць, што амаль ва ўсіх куткох нашага краю беларуская справа пайшла хутка ўперад.

Там, дзе яшчэ некалькі год таму назад панавала нацыянальная цемра, дзе беларуская нацыянальна сьведамая адзінка была музэйнай рэдкасьцяй — цяпер справа выглядае зусім інакш. З гушчаў Беларускага народу вырасьлі кадры нацыянальных барацьбітоў, стойкіх і моцных, якія даюць добры прыклад акружаючаму беларускаму насельніцтву.

Сьмела можам сказаць, што беларуская справа апёрлася ўжо на моцным, запраўды народным грунце.

Беларуская нацыянальная праца ў Зах. Беларускіх землях не ўмяшчаецца ўжо ў вузкія арганізацыйна-статутовыя рамкі, у якія яно ўстаўляецца мяйсцовымі ўладамі і якія што-раз то робяцца вузейшымі.

Фактам, напрыклад, ёсьць тое, што ня ўсюды магчыма залажыць нават культурна-асьветную беларускую пляцоўку, ці-то будзе гурток Беларускага Інстытуту Г. і К., ці Т. Б. Ш. —розьніцы ня робіць.

Заўсёды знаходзяцца розныя „перашкоды“ для паветавых адміністрацыйных уладаў, каб незалегалізаваць беларускай арганізацыі і гэтак сыстэматычна замарожваецца будаўніцтва беларускіх культурна-асьветных і гаспадарчых арганізацыяў.

У сілу неабходнасьці само жыцьцё прабівае сабе дарогу і знаходзіць іншыя шляхі для нацыянальнай беларускай працы, для якой уселякія перашкоды зьяўляюцца толькі школаю, дзе людзі набіраюць грамадзкага гарту і нацыянальнай энэргіі. Шмат ёсьць такіх праяваў, якія аб гэтым сьведчаць і якія запраўды даюць нам веру ў лепшую будучыню Беларускага народу.

Перадусім (і гэта будзе ці не найпаважнейшай праявай нашай нацыянальнай жыцьцездольнасьці) сюды трэба залічыць саматужную і самаахвярную працу беларускіх вясковых дзеячоў, якія з прычыны спэцыфічных абставінаў нашага краю змушаны абыходзіцца без беларускіх арганізацыяў.

Што-ж яны робяць?

А вось што: — пашыраюць беларускае друкаванае слова, закладаюць вандроўныя бібліотэчкі, вучаць дзяцей беларускай граматы, ставяць беларускія прадстаўленьні, выкарыстоўваючы ўсялякую да таго магчымасьць, вядуць прапаганду беларускай нацыянальнай ідэі, пішуць у беларускія газэты і журналы; у многіх выпадках навучаюць моладзь пяяньня беларускіх песьняў і г. д.

Вельмі добрым элемэнтам для беларускай справы аказалася моладзь, акончыўшая польскія школы, якая з усёю прагаю сваёй маладой душы накідаецца на беларушчыну, пасьля чаго звычайна не застаецца й сьледу ад польшчыны, якая зашчаплялася ў польскай школе.

Ня горш выглядае справа і з школьнаю дзетвароню, якой даволі даць у рукі нейкую беларускую казку, каб яна за некалькі гадзін навучылася ня толькі чытаць, але й шанаваць сваё друкаванае слова!

Нашаю нацыянальнаю гордасьцю ёсьць беларуская моладзь, якая адрозьніваецца умысловымі здольнасьцямі і да таго зусім не паддаецца вынарадаўленьню. Заўважана нават, што там, дзе жывуць сярод беларусаў іншыя народы — гэтыя апошнія, асабліва моладзь, вельмі хутка беларусізуюцца.

Да вельмі дадатных зьявішчаў трэба залічыць і тое, што моладзь, якая вучыцца ў польскіх гімназіях, рвецца да беларускай працы праз гурткі беларускай самаасьветы і іншымі спосабамі.

Здараюцца й такія выпадкі, калі без усякіх вонкавых уплываў гімназісты-беларусы ў катэгарычнай форме дамагаліся, каб навука рэлігіі выкладалася ім у беларускай мове.

Праўда, расейскія папы змушаныя да гэтага самымі вучнямі гаворац на лекцыях рэлігіі нібы пабеларуску перакручваючы словы і калечачы беларускі язык. Але й гэта не адстрашае, бо гэтакі поп пападае сам у вельмі сьмешнае палажэньне, асабліва калі вучні пачынаюць яго мову папраўляць.

Беларуская праца на ўсім сваім шырокім фронце рушыла з мейсца, змагаючыся з хвалямі полёнізацыі і ўплывамі расейска-ўсходняй абструкцыі — і гэта ёсьць фактам, якога ня бачаць толькі тыя, што ня хочуць гэтага відзець.

Найцікавейшае ў гэтым тое, што гэная праца вядзецца саматужна — самым народам, катораму ягоны нацыянальны інстыкт паказвае свой шлях.

Ня сумна ўжо выглядае народная справа у Зах. Беларускіх землях.

Беларусы ад слоў перайшлі ўжо да дзела!

А. Смолька.

БЕЛАРУСЫ! Прысылайце ахвяры на фонд беларускай асьветы! — Пашырайце беларускае друкаванае слова. — Навучайце дзяцей чытаць і пісаць пабеларуску!

З беларускай выдавецкай нівы ў Зах. Беларусі за 1935 г.

I.

Wincuk Adwažny — Kazka ab rybaku i rybcy. Wyd. St. Hlakoŭskaha i J. Najdziuka. 1935, bač. 29. Cana 25 hr.

Wincuk Adwažny — Chłapiec. Powieść. Wyd. „Bieł. Krynicy,“ Wilnia 1935, bač. 242. Cana 1.50.

Wincuk Adwažny — Hanuliny Kłapoty. (Humarystyčnaje apawiadańnie wieršam). Wyd. „Bieł. Krynicy“, Wilnia, 1935, bač. 64. Cana 50 hr.

Ф. Акінчыц — Аграрная коопэратыўная палітыка ў будучыні, Выд. „Новага Шляху“, Вільня, 1935, бач. 36. Цана 20 гр.

Aniško D. — Da biełaruskaha narodu. (Zaklik da wiernaści). Wyd. „Chr. D.“ Wilnia, 1935, bač. 39. Cana 20 hr.

Цешча ў дом — усё уверх дном. Камэдыя. Пераклад. Вільня, 1935, бач. 38. Цана 40 гр.

Hrynkiewičy dr. Stanisłaŭ i dr. Jadwiha — Rady chworym i zdarowym, častka I. Ab zaraznych i inšych chwarobach. Wyd. „Bieł. Krynicy,“ Wilnia, 1935, bač. 119. Cana 50 hr.

Казлоўшчык Ул. — Шляхам Змаганьня. Зборнік вершаў. Выд. „Нов. Шляху“. Вільня, 1935, бач. 62. Цана 75 гр.

Karalenka M. — Majowy chrušč i sposaby baraćby z im. Wyd. „Samapomačy“, Wilnia 1935, bač. 12. Cana 10 hr.

Karalenka M. — Zach. Biełaruś jak abšar faŭnistyčnych doślедaŭ. Wyd. Bieł. Stud. Sajuzu. Wilnia, 1935, bač. 8 Cana 20 hr.

Biełaruski Narodny Kalendar na 1936 hod.

Беларускі Народна-Гаспадарскі Календар на 1936 год.

Беларускі Календар 1936. — Выд. Т. Б. А.

Беларускі Адрыўны Календар на 1936 год.

Купала Я. — Шляхам Жыцьця. Зборнік вершаў. Выд. III Бел. Інст. Гасп. і Культуры, Вільня 1935, бач. 269. Цана 2 зл.

Машара М. — Вясельле. (Вершаванае апісаньне сялянскага вясельля). Выд. ТБА. Вільня, 1934. Цана 25 гр.

Машара М. — На прадвесьні. Зборнік вершаў. Выд. Ст. Глякоўскага і Я. Найдзюка. Вільня 1935, бач. 95. Цана 1 зл.

Officium Najśw. Dziewy Maryi Niepawinnaha začacia. (Hadzinki). Pieradruk z „Hołasu Dušy.“ Wyd. „Biel Kat. Wydawiectwa.“ Wilnia 1935, bač. 16 Cana 10 hr.

Рэгулямін Бел. Нац. К-ту ў Вільні.

Станкевіч Ад. — Праф. Браніслаў Элімах Шыпіла. З яго жыцьця і працы. Выд. Бел. Інст. Гасп. і Культуры. Вільня, 1935, бач. 23. Ц. 25 гр.

Станкевіч Ад. — Да гісторыі беларускага палітычнага вызваленьня. Выд. „Шляху Моладзі“, Вільня, 1935, бач. 128. Цана 1 зл.

Станкевіч Я. Др. — Апытальнік да зьбіраньня асаблівасьцяў бел. языка. Выд. Беларусаведы. Вільня, 1935, бач. 48. Цана 50 гр.

Stepowič A. — Za Baćkaŭščynu. Śpieŭnik Wyd. Bieł. Inst. Hasp. i Kultury. Wilnia, 1935, bač. 24. Cana 75 hr.

Tarasewič I. ks. dr. praf. — Biełarusy ŭ świátle praŭdy (teolohična-nacyjanalny narys). Wyd. „Chr. D.“, Wilnia, 1935, bač. 40. Cana 20 hr.

Uspamin z Kalwaryi. — (Prawadnik pa Kalwaryi). Wyd. „Bieł. Kat. Wydawiectwa“ na prawoch rukapisu. Wilnia, 1935, bač. 23. Cana 10 hr.

II.

Беларуская Крыніца. Палітычная, грамадзкая й культурная газэта. Тыднёвік. Год Выд. XIX-ы.

Беларуская Борць. Месячнік пчалярства і мядова-лякарскіх зёлак. Год выд. II. Выходзіць непэрыодычна.

Выясьненьні. (Аднаднёўка). Выд. М. Манцэвіч.

„Студэнцкая Думка,“ № 1 (15). Месячнік. Выд. Бел. Студ. Саюзуу ў Вільні. Вых. непэрыод.

Да Злучэньня — Бел. рэлігійны (уніяцкі) часапіс. Месячнік. Год выд. IV.

Калосьсе. Літаратурна-навуковы часапіс. Квартальнік. Год выд. I.

Крыгалом. Літаратурна-мастацкі месячнік. Выйшаў толькі адзін нумар. (Сканфіскаваны).

Новы Шлях — орган бел. нац-соц. думкі. Год выд. III Выходзіць непэрыядычна.

Наша Воля. Бел. незалежны двутыднёвік. Год выд. I.

Praleski — miesiačnik dla dziaciej. Hod wyd. II.

Родны Край — орган Т-ва Бел. Асьветы. Тыднёвік. Год выд. III.

Самапомач — Бел. кооп.-гасп. часапіс. Месячнік. Год выд. IV.

Сьветач Хрыстовае Навукі. Месячнік для мэтадыстаў. Выйшлі толькі тры нумары.

Шлях Моладзі. Месячнік. Год выд. VIII.

Chryścijanskaja Dumka.“ Bieł. katalicki časapis. Miesiačnik. Hod wyd. VIII.

U Litoŭcaŭ

10-lećcie „Sajuzu Litoŭskich Wučycialoŭ“. 29 XII min. hodu ź nahody 10-lećcia swajho isnawańnia „Sajuz Litoŭskich Wučycialoŭ“ mieŭsia naładzić akademiju, adnak Starasta m. Wilni na akademiju nia daŭ dazwołu.

Kanfiskaty. 23.XII min. h. Starasta m. Wilni skanfiskawaŭ Nr. 101 „Viln. Ryt.“ za wyjaśnieńnie Prezydyjumu Tymč. Lit. K-tu i za karespondencyju z Hajlušaŭ. „Kur. Wil.“ pisaŭ, što hety numar „Viln. Ryt.“ byŭ skanfiskawany za toje, što ŭ swaich wyjaśnieńniach padaŭ niepraŭdziwyja wiestki ab zajawie pradstaŭnika ŭłady.

Skanfiskawany tak-ža byŭ i Nr. 102 za artykuł „Ab litoŭskaści ŭ relihijnym žyćci“ i za karespondencyju z Ramuciaŭ.

Spatkańnie Nowaha Hodu. 31.XII min. h. litoŭskija wučyciali i studenty ładzili spatkańnie Nowaha Hodu, na jakim byli ŭsie kirunki litoŭskaha hramadzianstwa.

10 lećcie časapisu moładzi. „Jaunimo Draugas“, orhan litoŭskaj moładzi, u hetym miesiacy światkuje 10-ja ŭhodki swajho isnawańnia. Z hetaj nahody wyjšaŭ hetaha časapisu jubilejny numar.

† inž. J. Vengris. 23.XII min. h. było prywieziena ŭ Wilniu cieła pamioršaha inž. J. Vengrisa. Nastupnaha dnia adbyłosia nabaženstwa i pachowiny. Vengris doŭhija hady až da śmierci pracawaŭ jak horny inžynier u Polščy, u Sasnoŭcy. Z litoŭskim narodam i jaho sprawami zaŭsiody byŭ u žywoj łučnaści.

Wilenski Litoŭski Narodny K t. „Viln. Ryt.“ piša, što Starasta m. Wilni patrebawaŭ ad Tymč. Wilenskaha Litoŭskaha K-tu pierahistrawacca i źmianić swaju nazowu, wykidajučy słowa „Tymčasowy“. Dziela hetaha Tym. Lit. K-t z hetaha času budzie zwacca Wilenski Litoŭski Narodny K-t.

Украінскі зьезд „Рідной Школи.“

У Львове 25 сьнежня 1935 г. адбыўся агульны зьезд дэлегатаў украінскага культурна-асьветнага т-ва „Рідна Школа,“ якая дзеіць на тэрыторыі Зах. Украіны (у граніцах польскай дзяржавы).

На зьезд прыбыло 268 дэлегатаў і 66 гасьцей. Зьезд адкрыў старшыня Т-ва праф. Іван Галушчынскі, які зьезду даў справаздачу з дзейнасьці „Рідной Школи“ за мінулы год.

З гэтай справаздачы даведваемся, што „Рідна Школа“ мае 78 332 сяброў. Асновай „Рідной Школы“ ёсьць гурткі, якіх „Р.Ш.“ мае 1906; гэтыя гурткі зьвязваюцца ў Паветавыя Саюзы „Р.Ш.“, якіх ёсьць 5.

Справаздаўца адзначыў, што гурткі і Паветавыя Саюзы „Р.Ш.“ разрастаюцца памысна, але дзяржаўныя адміністрацыйныя ўлады, у многіх мясцох, не легалізуюць новых гурткоў і Паветавых Саюзаў.

Дзейнасьць „Р.Ш.“ абыймае шырокія прасторы ўкраінскай зямлі і шмат гадуе ўкраінскай моладзі. Пачаткавых школаў „Р.Ш.“ мае 33, гімназіяў — 12, адну фаховую гандлёвую школу і гадавыя гандлёвыя курсы; мае 4 школы рамесьніцкія — краўцоў, мэталёўцаў, сталяроў, шаўцоў і інш. Апрача гэтага „Р.Ш.“ утрымлівае 5 бурсаў і 400 дзіцячых садкоў. „Р. Ш.“ праводзіць і хатняе навучаньне — у мінулым годзе пад кіраўніцтвам „Р.Ш.“ вучылася дома 418 дзяцей.

Культурная дзейнасьць „Р.Ш.“ на гэтым ня спыняецца — гэтая арганізацыя выдае два разы ў месяц свой часапіс „Рідна Школа,“ ладзіць курсы для дарослых і арганізуе падрастаючую моладзь, якая выходзіць з пад нагляду школьнага — якая перастае вучыцца.

„Рідна Школа“ — гэта найбольшая і найпаважнейшая украінская культурна-асьветная арганізацыя ў Зах. Украіне, якая ў цяжкіх варунках для Украінскага народу вытрывала шырыць сярод украінцаў сваю культуру і гэтым закладае наймацнейшы фундамант украінскай будучыні.

Ab polskaj kolonizacyi na biełaruska-litoŭska-ukrainskich ziemlach

Jašče ŭ 1916 hodzie praf. Antoni Gurski (palak) pisaŭ: — čakaje nas wialikaje zadańnie, jakoje polski narod musić wyrašyć. . Musim čaść Biełarusi i Wałyni skolonizawać, — musim tam załažyć tysiačy asieliščaŭ polskaj kultury i polskaj haspadarki.

Hetak pisaŭ praf. Gurski tady, kali niezaležnaja Polšč była sprawaj budučyni.

Paśla paŭstańnia niezaležnaj Polščy hetaje „wialikaje zadańnie“ praf. Gurskaha stałasia aktualnym wa ŭsich polskich kruhoch. Pačałosia polskaje wajskowaje asadnictwa na litoŭska-biełaruska-ukrainskich etnohrafičnych ziemlach, jakija apynulisia ŭ hranicach maładoj adrodžanaj polskaj dziaržawy. Prawodziłasia adnačasna tak-ža i cywilnaja polskaja kolonizacyja na hetych ziemlach.

Ciapier, pad znakam baraćby z haspadarčym kryzisam, u Polščy sprawa kolonizacyjnaja stanowicca ŭznoŭ „wialikim zadańniem“ i wielmi aktualnaj. Ab hetym mnoha haworać niekatoryja polskija ekanamisty i palityki, ab hetym uściaž piša polskaja presa roznych kirunkaŭ.

Pawodle wykazwanaha ŭ presie planu, nowaja polskaja kolonizacyja na etnohrafična niapolskich ziemlach maje prawodzicca wiedamym starym šlacham — zakładywańniem asieliščaŭ polskaj kultury i polskaj haspadarki.

Tut treba adznačyć, što na etnohrafična litoŭska-biełaruska ukrainskich ziemlach žywie hustoj masaj miascowaje, nacyjanalna i socyjalna świedamaje, litoŭskaje, biełaruskaje i ŭkrainskaje sialanstwa; hetaje sialanstwa pierawažna małaziamielnaje i biezziamielnaje, jakoje čakaje taho času, kali jano dastanie ŭ swaim kraju zapasy ziamli ŭ swajo waładańnie. Treba tak-ža adznačyć, što litoŭskaje, biełaruskaje i ukrainskaje hramadzianstwa suproć polskaj kolonizacyi na hetych ziemlach rašuča spraciŭlajecca. I heta zusim zrazumieła.

Dla miascowaha nasielnictwa hetych ziamiel adzinym warštatam pracy i žarałom isnawańnia źjaŭlajecca ziamla. Biezziamielnaść i małaziamielnaść dachodzić tut da krajnaści. Biezrabotnych sialan poŭnyja litoŭskija, biełaruskija i ukrainskija wioski. Hetyja „lišnija ludzi“ čakajuć sprawiadliwaj ziamielnaj reformy — čakajuć ziamielnych warštataŭ pracy.

Dziela hetaha kličy j zaachwočywańnie ŭ polskaj presie da polskaj kolonizacyi h. zw. „kresuw“ siarod miascowaha nasielnictwa wyklikaje niezdawaleńnie i abureńnie. Tut idzie tolki ab fizyčnaje isnawańnia miascowaha sialanstwa. Tut u hetym wypadku niama inšaj palityki. Dyk kolonizacyjnyja plany nie pawinny mieć miesca, dzie miascowaje nasialeńnie prymiraje z hoładu z niastačy warštatu pracy — z niastačy ziamli.

p.

Pastanowy Lihi Narodaŭ—palityka Anhlii i Francyi

Ciapier uwieś palityčny świet zorka pryhladajecca na chod sprawy datyčačaj italijanska abisynskaj wajny, jakuju ŭziałasia ŭcichamiryć Liha Narodaŭ — wyraźniej Anhlija i Francyja.

U Anhlii i ŭ Francyi kirujuć palityčnym žyćciom parlamanty — tam ministry zahraničnych spraŭ dajuć sprawazdaču z swajej palityčnaj dziejnaści parlamantam i ad parlamantaŭ dastajuć paŭnamoctwy dziela prawodžańnia palityki ŭ tym ci ŭ inšym kirunku.

U minułym miesiacy ministry zahraničnych spraŭ Anhlii i Francyi byli ŭzhodniŭšy prajekt spynieńnia wajny ŭ Afrycy, ab jakim my pisali ŭ „B. Krynicy“. Prajekt faktyčna addawaŭ paławinu Abisynii Italii, ale z takimi warunkami, što i dla Italii było-b niemahčymym utrymać abisynskija ziemli. Hetki prajekt miru byŭ zusim supiarečny z pastanowami Lihi Narodaŭ, dyk hramadzkaja apinija ŭ Anhlii i ŭ Francyi suproć takoha prajektu „miru“ mocna zareahawała. Pad naciskam hetaj hramadzkaj apinii anhielski ministr zahraničnych spraŭ Hor padaŭsia ŭ adstaŭku, a na jaho miesca ŭstupiŭ ministr Eden; francuski ministr zahraničnych spraŭ Lawal z hetaj sprawy mocna tłumačyŭsia ŭ parlamancie.

Paśla hetaha, anhielskaja i francuskaja zahraničnaja palityka maje dalej iści pa linii Lihi Narodaŭ, h zn. adnosna italijanska-abisynskaj wajny maje trymacca pastanowaŭ Lihi i papiaredniaj palityčnaj linii ŭ hetaj sprawie.

Italijanska-abisynskaja wajna pradaŭžajecca.

Kaladnymi światami na italijanska-abisynskim froncie pačalisia krywawyja bai nanowa. Abisyncy pačali nastupać na italijancaŭ na ŭsim froncie i ŭ niekatorych miascoch wielmi ŭdačna — šmat zabrali italijancaŭ u plen, adbirali tanki, harmaty, kulamioty i amunicyju. Italijancy z niekatorych pazycyjaŭ adstupili.

Italijancy razzławanyja stratami pačali rabić naloty aeraplanami na abisynskija miesty i kidać tam bomby z udušliwymi hazami i zapalnyja. Hetak źniščyli jany niekalki abisynskich miastečak i nia mała pabili biezbaronnych ludziej. U kancy italijancy pačali raźbiwać bombami z aeraplanaŭ abisynskija światyni i zbambardawali špital Šwedzkaha Čyrwonaha Kryža.

Suproć hetkich dzikich pastupkaŭ italijanskaha wajennaha kamandawańnia aburyłasia hramadzkaja apinija ŭ Šwecyi, u Anhlii i ŭ inšych cywilizawanych krajoch, pad naciskam jakoj aficyjalnyja pradstaŭniki hetych dziaržaŭ padali swoj pratest suproć hetkich pastupkaŭ italijancaŭ.

Heta tak-ža abciažyć dla Italii sprawu „wyjhrańnia“ wajny ŭ Afrycy.

Z anhielskaj zahraničnaj palityki.

Kiraŭnictwa anhielskaj zahraničnaj palityki abniaŭ ministr Eden, jaki maje na mecie zarhanizawańnie ahulnaje supracoŭnictwa ŭsich dziaržaŭ.

Apcšnija padziei ŭ Paŭnočnym Kitaju, ab jakich my ŭžo pisali ŭ „B. Krynicy“, wykapali propaść miž Anhlijaj i Japonijaj.

Eden rašajecca, ci addać Uschodniuju Aziju wykłučnym upływam Japonii ci wystupić razam z Sawietami suproć japonskaj ekspansii.

U eŭrapejskich palityčnych kruhoch ličacca z mahčymaściaj parazumieńnia Anhlii z Sawietami.

U Anhlii sawieckija sympatyi, paśla abniaćcia kiraŭnictwa zahraničnaj palitykaj min. Edenam, pačali ŭzrastać widawočna. Ab hetym świedčyć kanhres „miru i pryjacielaŭ S.S.R.R.“, jaki tam niadaŭna adbyŭsia pry ŭčaści 800 delehataŭ.

Pry hetym treba adznačyć, što min. Eden źjaŭlajecca rašučym woraham hitleroŭskaj Niamieččyny i pry chilnikam parazumieńnia z Sawietami.

Z francuskaj zahraničnaj palityki.

Francuskaja dyplomacyja šukaje ciapier daroh užo nowych dziela pamireńnia Italii z Anhlijaj u sprawie italijanska-abisynskaj wajny. Ale francuskija dyplomaty wiedajuć, što pierachileńnie francuskaj palityki na bok Italii hrazić Francyi stratej swajho stanowišča na karyść Anhlii nia tolki ŭ dziaržawach Małoj Antanty i na Bałkanach, ale i ŭ S.S.R.R. Dziela hetaha francuskaja dyplomacyja ŭ hetaj sprawie wielmi aściarožnaja i nadta pawolnaja. Francuski ministr zahraničnych spraŭ Lawal zajawiŭ: — francuska-anhielskaje supracoŭnictwa heta asnaŭnaja sprawa zabiaśpiečańnia miru ŭ Eŭropie. Pieršaja proba spynieńnia wajny ŭ Afrycy nie ŭdałasia, ale šlachi da miru astalisia čystyja.

Słowam, dyplomatyčnaja jhra Francyi z Anhlijaj u supracoŭnictwa dziela ŭtrymańnia miru ŭ Eŭropie i spynieńnia wajny ŭ Afrycy razyhrywajecca.

Amnestyja

3 h. m. u Polščy abwieščana amnestyja, pawodle jakoj zwolniena ad kary kala 30 tysiač asob.

Hetaja amnestyja abyjmaje mnohija prastupstwy palityčnyja, kryminalnyja i administracyjnyja, dakananyja ŭ časie da 11-ha listapada 1935 h.; karu śmierci zamianiaje jana na daśmiertnuju katarhu.

Waršaŭski praces

Sud nad ukrainskimi terorystami O.U.N., jaki adbywajecca ŭ Waršawie, — dachodzić da kanca. Prakurory ŭžo skazali swaje askaržajučyja pramowy, a abaroncy skazali pramowy abaronnyja. Prakurorskaje askaržeńnie damahajecca pakarać abwinawačanych Banderu, Łebedu i Karpynca śmierciaj, a inšych daśmiertnaj katarhaj i turmoj da nižej 10 hadoŭ. Praces, z pryčyny hreka-katalickich i prawasłaŭnych kaladnych świat, adłožany da 9 h. m.

Roznyja wiestki

Z kaścielnaha ćwintara i carkoŭnaha pahostu.

Biełaruski narod wyznaje relihiju chryścijanskuju — bolšaja čaść prawasłaŭnuju, mienšaja častka — katalickuju. Polskaje katalickaje duchawienstwa biełarusaŭ katalikoŭ nawučaje katalickaj wiery papolsku, a rasiejskaje duchawienstwa biełarusaŭ prawasłaŭnych nawučaje prawasłaŭnaj wiery parasiejsku. Biełarusy, jak prawasłaŭnyja tak i kataliki, uściaž damahajucca ŭ relihijnym žyćci rodnaj, biełaruskaj mowy, ale duchoŭnyja ŭłady trymajucca swajej palityki.

Pry hetym treba adznačyć, što ŭ apošnija hady prawasłaŭnyja archirei pačali zawodzić polskuju mowu i ŭ carkoŭnaje žyćcio i hetak pieratwarać rasiejskuju ŭ našym kraju carkwu na polskuju.

Słowam, majuć biełarusy polski kaścioł i maje być dla biełarusaŭ takža i polskaja carkwa. Cikawa tolki, ci biełarusy pryjmuć „polskuju wieru.“ Ciapier cerkwy na biełaruskich ziemlach amal užo pustyja i pastupowa puściejuć i kaścioły... I z hetaha dziwicca nia možna.

Z POLŠČY

Baraćba z haspadarčym kryzysam. Haspadarčy kryzys swaim ciažaram mocna prycisnuŭ promysł, handal i amal zusim zacisnuŭ ziemlarobstwa. Ciapierašni ŭrad raspačaŭ planowuju baraćbu z kryzysam i systematyčna jaje prawodzić haspadarčymi dekretami, jakija majuć urehulawać ekanamičnaje žyćcio i pieramahčy kryzys.

Z metaj baraćby z kryzysam urad maje zawieści ŭ Polščy h. zw. pałaty pracy („Izby pracy“), jakija buduć abapiortyja na asnowach samaŭradu. Hetyja pałaty majuć abniać pracaŭnikoŭ dziaržaŭnych, samaŭradawych, a tak-ža i pradpryjemstwaŭ publičnaha prawa. Wa ŭsiej Polščy maje być 5 hetakich pałataŭ z wyznačanaj dla kožnaj pałaty terytoryjaj.

Z ZAHRANICY

Pahroza nowaj wajny na Dalokim Uschodzie. Japonija adnosna Sawietaŭ pastupaje na Dalokim Uschodzie prawakacyjna — japonskija wajskowyja addziely časta pierachodziać hranicu to manholskuju i tam napadajuć na pahraničnuju stražu, to pierastupajuć z Mandžuryi hranicu sawieckuju i zadzirajucca z pahraničnym wojskam. Manholija, byccam, prasiła ŭžo SSRR abarony ad japoncaŭ, a balšawiki—byccam zhadzilisia baranić Manholiju ad Japonii.

Paśla hetaha, z Pekinu pawiedamlajuć hazety,—užo niadoŭha pryjdziecca čakać wajny miž Mandžuryjaj i Manholijaj, bo za Mandžuryjaj staić Japonija, a za Manholijaj — SSRR.

„Mocnaja sawieckaja siamja“ ŭ SSRR. Ahulna wiedama, što kamunisty wialikija praciŭniki chryścijanskaj siamji i što jany ŭ Sawietach biezahladna razburali hetuju siamju

staralisia wykasawać nawat z serca tudziej pačućci siamiejnaha sentymenu. Hety hrech mocna pamściŭsia — u Sawietach pajawilisia armii „biezpryzornych,“ u baraćbie z jakimi kamunisty waročajucca da siamiejnaha ładu, a balšawickija hazety pišuć i zaklikajuć da twareńnia „mocnaj sawieckaj siamji.“

Kaladnaja jalinka. Da sioletniaha hodu sawieckija ŭłady na ŭstrojwańnie kaladniaj jalinki hladzieli niaprychilna, a kamunistyčnyja arhanizacyi zmahalisia z tredycyjaj jalinki naroŭni jak i z tradycyjami relihijnymi. Sioleta-ž sawieckaja ŭłada tyja raptam zahadała, kab usie sawieckija hramadzianie prybirali na Nowy Hod (nie na Kalady) u siabie doma jalinki, a sawieckija hazety ŭsich da hetaha pačali zaachwočwać. Usio heta robicca, kab uzmocnić siamju, kab abahreć siamiejnaje wohnišča.

Z hetaha bačym, što kamunisty pad naciskam prawa žyćcia pryznajuć patrebnaj u razumieńni ahulnaludzkim siamju, a tak-ža i narodna-relihijnyja tradycyi.

„Niechryścia nie zapisywajem.“ U Kirgizii ŭ w. Sezanowka, Issyk-Kulskaha wokruhu niejkaja Kulkinawa źjawiłasia ŭ sawieckaje taho rajonu biura i zajawiła, što jana paradziła syna i prosić jaho zarehistrawać. Sekretarka biura adkazała, što śpiarša treba achryścić dzicia, bo „my niechryścia nie zapisywajem“ i pryhetym napisała da świaščeńnika aficyjalnaje piśmo: — „Da carkwy. Hram. Duchoŭniku. Prašu achryścić dzicia. Chłapiec. Biura rejestracyi. Sałaŭjowa.“ Zapisali ŭ sawieckija rejestry dzicia tolki tady, jak matka pryniesła ad świaščeńnika paświedčańnie, što dzicia achryščana.

Widać kamunistam baraćba z relihijaj nie ŭdajecca...

Darahaja wajna. U 1935 h. Italija wydała na wajnu ŭ Afrycy 975 miljonaŭ liraŭ. Apračа hetaha budowa daroh u Afrycy kaštuje Italii ŭžo 840 miljonaŭ liraŭ.

Wodhuki kamunistyčnaj rewalucyi ŭ Brazylii. Apošniaja kamunistyčnaja rewalucyja ŭ Brazylii, ab jakoj my ŭžo pisali ŭ „B. Krynicy,“ wykryła ŭ niekatorych dziaržawach paŭdzionnaj Ameryki, asabliwa ŭ Urahwaju, zmowu kamunistaŭ procі ŭ isnujučaha tam ładu. Kiraŭnictwa zmowy mieła byccam suwiaź z Maskwoj. Z hetaj pryčyny Urahwaj sarwaŭ dyplomatyčnyja znosiny z Sawietami i hetym hroziać Sawietam i inšyja dziaržawy. Sawiecki ŭrad adrakajecca ad suwiazi z tamašnimi kamunistami i zajaŭlaje ŭ Lihu Narodaŭ, što Sawiety kamunistaŭ u Amerycy nie padtrymliwali i nie padtrymliwajuć.

Ziemlatrasieńnie. U siaredniaj Eŭropie, asabliwa ŭ Šwajcaryi, 31.XII 1935 było čutno ziemlatrasieńnie — čutny byli ŭzdryhi ziamli, jakija bolšaj škody nie narabili.

Z KRAJU.

Amnestyja. U našym Kraju mnoha ludziej zasudžana na wastrožnyja kary. Amnestyja zwolniła z wastrohu žycharoŭ Biełastockaha wajawodztwa likam bolš 1250 wiaźniaŭ i nia mienš druhich wajawodztwaŭ — Nawahradzkaha, Wilenskaha, a tak-ža i Paleskaha.

Hałaledź. U minułym tydni wa ŭsim Kraju, asabliwa na Nawahradzkim ŭzwyššy, hołaledź narabiła mnoha škody — padajučy doždž adrazu zamiarzaŭ, i hetak abmiarzali drewy, što niawytrymaŭšy ciažaru łamalisia. Mnoha pałamana sadoŭ i prysadaŭ.

Спраставаньне.

Д-р Янка Станкевіч прынёс у нашую рэдакцыю пісьмо, у якім заяўляе, што „Беларускі Народна-Гаспадарскі Календар на 1936 г.“ і „Biełaruski Narodny Kalendar na 1936 h.“ „ня маюць ніякага аднолькавага зьместу“.

Чытайце і пашырайце адзіны беларускі гаспадарскі часапіс „САМАПОМАЧ“! Пробныя нумары высылаюцца бясплатна. Адрас: Red. „Samapomač“, Wilnia — Wilno, Połackaja Nr. 9—4.

Da čytačoŭ „Biełaruskaj Krynicy“

HRAMADZIANIE!

„BIEŁARUSKAJA KRYNICA“ wydajecca koštam składak i achwiaraŭ jaje čytačoŭ. **Składka: na hod 4 zł., na paŭhodu 2 zł., na try miesiacy 1 zł.**

Wydawiectwa „BIEŁ. KRYNICA“ dziela pašyreńnia i pahłybleńnia ŭ biełaruskich narodnych masach nacyjanalnaj, socyjalnaj i palityčnaj świedamaści raspaŭsiudžwaje biełaruskaje drukawanaje słowa — hazety, knižki, brašury i žurnały.

Wydawiectwa „BIEŁ. KRYNICY“ dla swaich čytačoŭ wyznačyła premiju ŭ formie knižak na 1936 hod.

Chto pryšle da 1 sakawika 1936 h. składku na cely hod — 4 zł., toj atrymaje premiju z 4-ch knižak:

1) «КАРОТКІ НАРЫС ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ» — У. Ігнатоўскі,
2) «РОДНЫ КРАЙ» — чытанка для дзяцей Л. Гарэцкай,
3) СЬМЕРЦЬ КАСТУСЯ КАЛІНОЎСКАГА» — М. Машара
і 4) „KAZKA AB RYBAKU I RYBCY“ — W. A.

Hrošy treba słać na adras „BIEŁ. KRYNICA“, Wilno, Zawalnaja 1—1.

UWAHA. Stałym supracoŭnikam i karespandentam Wydawiectwa hazetu pasyłaje biazpłatna, a tak-ža na žadańnie wyšle i wyšejaznačanuju premiju.

Wydawiectwa „Biełaruskaje Krynicy“.

Пісьмы з вёскі

Беларуская культурная праца і польскае „кулка“.

Райца, Навагрaдзкага пав. Дзіўнае зьявішча — каля праваслаўнай царквы ў беларускім краю чутны дух царска-расейскі, каля каталіцкага касьцёла — пахне польскім эндэцкім нацыяналізмам, а каля волaсьці — цэнтралістычна-„краёвым“ нацыянальна польскім, модным цяпер „regjonalizmam“. За два, тры дзесяткі мэтраў ад гэтых цэнтраў іхняга „духу“ ўжо ня чуваць і там чысты дух беларускі. Школа польская ўплыву на беларусаў ня робіць ніякага — беларускія дзеці полёнізацыі не паддаюцца.

Гэтак ва ўсім нашым Краю, гэтак ёсьць і ў нашай Райчанскай волaсьці.

У в. Дуброва, нашай волaсьці, у студзені мінулага 1935 г. зарганізавалася аматарская тэатральная трупа — мясцовая моладзь пад кіраўніцтвам Р. Зайка, Ул. Адамовіча і М Зянькевіча. Першае прадстаўленьне зладзілі ў вёсцы Аконавічах, Цырынскай волaсьці, летам 1935 г.; ставілі „Ня розумам сьцяміў а сэрцам“; паўтарылі гэнае прадстаўленьне ў в. Валяўцы, нашай волaсьці. Ладзілі беларускія прадстаўленьні так-жа і ў сваей вёсцы. Пасьля прадстаўленьняў заўсёды дэклямавалі беларускія вершы. Найбольш адзначыліся Зенькевічанка і Новік. Людзі былі здаволены з гэтых прадстаўленьняў і чакаюць гэткай працы моладзі болей. Цяпер аднак моладзь наша нешта прыціхла і беларускіх прадстаўленьняў ня ладзіць.

Дарагая моладзь, ня кідай гэтай працы, але пачатую добрую справу разьвівай і пашырай — арганізуй беларускія прадстаўленьні і са сцэны прасьвячай беларускую вёску.

— —

Райчанскі валасны сэкратар з нейкім інструктарам польскай арганізацыі „млодзежы вейскей“ арганізавалі ў нас польскае „Кулко Рольнічэ“. На сход прыйшло 12 асоб, але ня ўсе запісаліся ў „кулко“. Сэкратар тады сказаў прамову, у якой казаў, што моладзь наша з цемры ня выйдзе, бо ня хоча слухаць арганізатараў польскіх „кулак“.

Паночкі арганізатары польскіх „кулак“. Ці-ж Вам ня ведама, што беларусам патрэбная свая беларуская арганізацыя. Ведайце, што беларусы ўжо знаюць, дзеля чаго існуюць на беларускіх землях польскія арганізацыі. Беларусы ў польскія арганізацыі ня пойдуць. Нам трэба сваей арганізацыі.

Дуброўскі.

Трэба асьветы.

Калодзіна, Пастаўскага пав. Нашая вёска складаецца з 35 гаспадароў. Людзі ў нашай вёсцы ўсе праваслаўныя беларусы; усе яны мала сьведамыя і ўсе — старэйшыя і моладзь — цёмныя і мала граматныя. Газэтамі і кніжкамі нашыя цёмныя сяляне ня цікавяцца. У нашую вёску прыходзіць, пакульшто, толькі адзін экзэмпляр беларускай газэты — „Беларускай Крыніцы“.

Як праява цемнаты выяўляецца сярод нашай моладзі п'янства — хлопцы робяць вечарыны і на гэтых вечарынах п'юць дэнатурат, а напіўшыся б'юцца. Сьляды дзікіх паступкаў нашыя людзі носяць цэлае жыцьцё — ад пабояў знакі на галаве некаторыя носяць аж да гробу.

Дарагія браты, асабліва моладзь, змагаймася з цемнатой — выпісваймa газэты, кніжкі і чытайма іх. Зарганізуйма бібліатэку і прасьвячаймася супольна — усе разам. Прасьвячаймася самі і дбайма аб нашых малодшых, дбайма аб нашых дзяцей — дамагаймася для іх школы ў роднай мове. Дамагаймася адкрыцьця ў нас беларускай школы.

І. К.

Аб жыцьці нашай ваколіцы.

Бернатаўшчына, Дварэцкай вол., Навагрaдзкага пав. Ужо некалькі гадоў прыходзіць у нашую вёску „Беларуская Крыніца,“ якая паказвае нам шлях да лепшай долі і выясьняе сучаснае палажэньне беларускага народу, а так-жа апісвае аб жыцьці іншых народаў.

Пішуць у „Б. Крыніцу“ адусюль і аб усім, але ад нас дык найменш. А пісаць і ад нас ёсьць аб чым.

У нас усе беларусы, але ёсьць і выpадкі, што беларушчыны сваей чураюцца — баяцца ці мо стыдаюцца прызнавацца, што яны беларусы. У нашай волaсьці быў войтам Адольф Рысюк — свой чалавек, але ён казаў, што ў нашай волaсьці беларусаў „няма.“ Ведама, Рысюку на гэта ніхто ня даў веры, хоць ён гэта казаў і будучы войтам. Рысюка ў волaсьці ўжо і сьлед прастыў, а беларусы ў нашай волaсьці як жылі, так жывуць і будуць жыць, ды яшчэ лепш, бо ўсьведамляюцца і прасьвяшчаюцца.

Нашая вёска стройная; ляжыць яна на лясістых і ўраджайных грунтох Беларусі. Прыгожы наш Край! ах, які прыгожы! Жыхары нашай вёскі амаль усе праваслаўныя, а нацыянальна ўсе беларусы. Займаюцца нашыя людзі толькі земляробствам, якое цяпер ніякага не даець даходу. Гаспадаркі нашых земляробаў дробненькія — ёсьць і па аднаму гактару зямлі; безработных у вёсцы людзей многа, заработкаў у нашых ваколіцах няма ніякіх. Зямля нашых гаспадароў у шнюркох. У будучым годзе мае адбыцца ў нас комасацыя. Ці будзе лепш — няведама. Цяпер падаткі, налогі і кары для нашых сялян надта цяжкія — трудна выплаціцца. Апрача гэтага трэба сплачываць і даўгі, якія зробленыя ў лепшыя гады. Сэквэстратары ў нас сталыя „госьці.“ Сьпярша нашыя людзі, асабліва кабеты, баяліся іх, а цяпер „прывыклі“ і ніхто ўжо не баіцца — як голыя дажджу.

Нашая моладзь, таксама і старэйшыя, гарэлкі ня п'юць. Нашая моладзь ахвотна горнецца да беларускіх кніжак, да роднай газэты і агулам да прасьветы.

Сваей беларускай арганізацыі у нас, пакульшто, няма, але моладзь зьбіраецца арганізаваць гурток Бел. Інстытуту Гасп. і Культуры. Бяда ў нас, што няма каму адпаведна арганізацыяй пакіраваць. Ёсьць у нас і інтэлігентная асоба — студэнт, але што з яе для беларусаў — гэты студэнт вучыцца на пана і беларусаў адгаварвае ад арганізацыі, ад роднай газэты і агулам ад беларускай народна-соцыяльна адраджэнскай працы.

Дзяўчаткі нашыя крыху слабаватыя духова — надта паддаюцца ўплывам гарадзкой моды: купляюць дарагія торбачкі і носяць іх у руках безпатрэбна; купляюць пудру і пэцкаюць ёй свой сьвежы, здаровы і прыгожы твар. Гэтак з торбачкай у руцэ і абпэцкаўшыся пудрай, як камінар сажай, нашыя дзяўчаткі гавораць нейкай беларуска-польскай трасянкай — калечаць мову беларускую, выкрыўляюць словы польскія — і гэта мае быць далікатней і папанску.

Дарагія дзяўчаткі, не асьмяшайце самі сябе — будзьце ўсюды такія прыгожыя, як у сваей вёсцы — не абсыпайцеся пудрай і ўсюды гаварыце так, як гаворыце ў сваей хаце і з суседзямі.

Мак.

Naša pošta

Janka Kalina. Pišycie lepš prozaj; da nas prysyłajcie wiestki ab žyćci ŭ Wašaj wakolicy. Probnuju Wašuju pracu pieradali ŭ redakcyju „Шляху Моладзі.“

Anton Čaromchin. Wašyja twory pieradali ŭ red. „Шляху Моладзі“. Pišycie prozaj, u našuju redakcyju prysyłajcie karespandencyi ab wiaskowym žyćci

A. S. — siabra B.CH.D. Wašyja piśmiennyja zaŭwahi adnosna prahramy abnoŭlenaj B.CH.D. pieradali ŭ Prezydyjum CK. B.Ch.D.

Bodak. Manetu i pieśni atrymali, dziakujem; manetu pieradali ŭ muzej Б.І.Н.іК., a pieśni ŭ specyjalnuju sekcyju hetaj instytucyi. Tekst pieśni biez melodyi nia maje poŭnaj wartaści — pastarajciesia zapisywać i melodyi pieśniaŭ.

Kruk B. Atrymali, dziakujem, karystajem. Starajciesia pisać wyraźniej, bo trudna razabracca.

Dubroŭski. Atrymali, karystajem, dziakujem, pišycie bolš

Dynamit. Wašyja rukapisy pieradali ŭ „Шлях Моладзі.“ Da nas pišycie ab žyćci ŭ wašaj wakolicy.

Prysutny. Atrymali, dziakujem, u nastupnym numary skarystajem.

ЧЫТАЙЦЕ
адзіны ў Заходняй Беларусі беларускі літаратурна-навуковы квартальны часапіс
„КАЛОСЬСЕ“,
у якім зьмяшчаюцца творы перадавых паэтаў і пісьменьнікаў Заходняй і Усходняй Беларусі, а так-жа артыкулы навуковага характару.
У 1935 г. выйшлі 4-ры кніжкі „Калосься“.
Складка на асобную кніжку найменш 1 зл.
Адрас рэдакцыі і адміністрацыі „КАЛОСЬСЯ“:
Вільня, Завальная вул. № 1—2.

Грамадзяне, пасьпяшайцеся з купляй
Беларускага Адрыўнога Календара на 1936 год,
бо пасьля можа ня стаць.
Купіць можна ўсюды.
Цана аднаго экзэмпляра 50 грошаў.

Redaktar Jan Paźniak. Biełaruskaja Drukarnia im. Fr. Skaryny ŭ Wilni, Zawalnaja 1 — 2. Wydawiec A. Šutowič